**Новости института**

 - Обновлено 09.05.2018 13:20
Опубликовано 09.05.2018 12:29
Автор: ОПРИиОС
Просмотров: 1641

Ужо прайшло семдзесят тры гады з таго часу, як савецкі народ атрымаў перамогу ў Вялікай Айчыннай вайне. Вялікая Перамога...

Напярэдадні супрацоўнікі Магілеўскага інстытута МУС ўсклалі кветкі на месца пахавання ветэрана Вялікай Айчаннай вайны Уладзіміра Данілавіча Кадзета, які на працягу доўгіх годоў працаваў ў міліцэйскай вну.

У інстытуце ў памяць аб гэтай падзее прайшоў памятны канцэрт, які нагадваў спектакль, напоўнены песнямі, вершамі і танцамі. І ў гэтай пастанове было ўсё: і мірны час, і жах ад вайны, і страты родных, і Вялікая Перамога. Усё, што адбывалася на сцэне кранула за душу кожнага гледача: часам на іх тварах былі слезы, часам усмешкі.

AA2BfJKDC4w|Концерт ко Дню Победы (2018)||t_width=250, t_height=150, pages=1, break=0, lightbox=0, button=1

9 мая ад плошчы Славы святочнае шэсце з удзелам ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, кіраўніцтва вобласці і горада, прадстаўнікоў працоўных калектываў і грамадскасці рушыла ў бок плошчы Леніна, дзе адбыўся мітынг. У святочны дзень на цэнтральнай плошчы абласнога цэнтра адбыўся парад вайсковых часцей Магілёўскага гарнізона, дзе супрацоўнікі і курсанты інстытута прайшлі ўрачыстым маршам.

Таксама курсанты і супрацоўнікі інстытута прынялі ўдзел у канцэрце на галоўнай святочнай пляцоўцы Магілева і прадставілі канцэртную праграму на мерапрыемстве, прысвечаным Дню Перамогі ў горадзе Быхаве.

Варта адзначыць, што курсанты інстытута добрасумленна ахоўвалі грамадскі парадак падчас правядзення святочных мерапрыемстваў.

*Любоў ШУМІЛКА*
*Фота аўтара*

news/2018/05/09maya


Phoca PDF